БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 38. Менск. Пятніца 10 мая 1918 г. Год I

АБВЕСТКА.

Менская Гарадзкая Управа просіць уласьнікау нірухомых менняу у горадзі Менску, ніунесшых ацэначнаго збору: аснауного за прошлыя годы і дадатковаго за 1918 рок, пасьпешацца унесьці лічушчыяся за імі нідоімкі, бо калі ні будуць унесены да 15 г. м., Управа змушана будзе ужыць прымусовыя спосабы для зыску іх з даходау, ад абложаных менняу.

Гарадзкі Галава **П. Кашчэнко.**

Пайду...

Пайду, куды сэрцо нас кліча.
Пайду, дзе пяюць салаўі
І вецяр дзе лісьця калыша,
І носіць уздохі зямлі.

* * *

Бо душна мне тут і так нудна,
Змарыуся я карак свой гнуць..
Заве мяне поле, як думкі,
Як рэчкі, што лесам цякуць.

* * *

І волі і шчасьця хачу я,
І бачыць хачу цэлы сьвет.
У хмары мне цяжка—у хмары
Калеча сябе чалавек!

Запольскі.

Менск 10/г.

Вельмі мыляюцца тыя, каторыя кажуць, што тады толькі можа пачацца нацыянальная культурная праца па Беларусі, калі ужо будзе наладжэны добра эканамічны добрабыт, а да тых часау трэба пачакаць з гэтай, нібы го, ніпершчароднай вартасьцю — культурнай працай.

Мы пэуны, што побач с першай павінна ісьці і другая работа зараз жа: адна дапауняе і дапамагае другой. Ні то што «ні адным хлебам чалавек жыу будзе»,—але да самаго здабывання гэтаго хлеба як найболей трэба культуры.

Тым болей цяпер, калі на Беларусі пачауся адліу вялікіх хваляу уцекачоу у свае родныя попялішчы, калі кінучае моро чужых людзей пачынае тут уменьшацца і наш край прыймае ранейшы кшталт — нам трэба пачаць культурную работу. Досіць будзе «спаць у шапцы», досіць беларускаму народу жыць адным чаканнем пеўных сноу будучыны—трэба зараз-жа будаваць і будаваць!

Ні чакалі гэтаго у нашым краю госьці нашыя — палякі. Сеці іхніх школау, нібы павуцінай, пакрылі усю Беларусь і ні то што каталікі-беларусы, але нават і праваслауныя вучыліся у гэтых школах, дзе сьпевалі патрыятычныя песьні з Варшавы.

Сам народ інстынктыуна патрэбуе школы—і самахвотна хлебаробы аддавалі сваіх дзяцей у польскія школы: «нехай хоць на польску вучыцца, калі німа у нас другіх школау—кажуць бацькі—бо вучыцца цяперашнім часам кожнаму трэба».

Болей чакаць нельга, бо шкоднае насенне чужога—варшаускаго патрыятычнаго духу наміж нашых дзяцей, дзякуючы польскім школам, для нашаго народу—рэч пінармальная. Дык вось, у адпор гэтаму, нам трэба як найхутчэй парупіцца аб сваіх нацыянальных школах, па усяму краю. Цяпер самы піадкладны час, бо да восені трэба гэта наладзіць.

Трэба перш-на-перш адкрыць беларускія вучыцельскія курсы, каб у восені пасьля працы на полі, беларускія дзеці маглі-б пачаць сваю адукацыю у роднай мове у сваей нацыянальнай школе. Трэба да восені падрыхтаваць школьныя падручнікі і усе другое, а то будзе позна.

Шмат дапамагчы гэтай вялікай справе могуць арганізатары беларускіх школау—дзеячы з «заакопнай» Беларусі. Там ужо у гэтым кірунку ад самаго пачатку акупацыі краю, за тры годы вайны шмат зроблено: там есьць па краю ужо каля двух сот беларускіх нацыянальных школау, там есьць у Сьвіслачы сэмінарыя беларускіх вучыцелеу, там есьць ужо шмат школьных падручнікау, там есьць ужо дзесяткі тысяч беларускіх дзяцей нацыянальна сьвядомых і гэта — самы найвялікшы плюс у беларускай справе за час вайны.

Беларуская Рада, побач з другімі заданнямі, павінна зараз жа дбаць аб нашай школе і нямецкі урад, каторы шмат дапамагау у гэтым кірунку у «заакопнай» часьці нашай Бацькаушчыны, пэуне пойдзе нам на сустрэч і тут.

Школы і толькі школы — залог нашаго добрабыту і нацыянальнаго істнавання нашай будучыны.

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу).

— Калісь і цяпер—кажа стары Міхалка у задуменні.

Калісь—пры большэвіках.

Цяпер—пры немцах.

Стары Міхалка,—дужы і гарапашны мужык—і «калісь» усьміхаўся і «цяпер» усьміхаецца. Усьмешку гэту ён хаваў і хавае у сваіх аграмадных сівых вусах. Вочы яго, умудроныя вопытом жыцця і «калісь» і «цяпер» філезафічна глядзелі і глядзяць на «ўсё» акружаючае.

Ен ні рубаў дровы у панскіх лясох, ен у камітэтчыкі ні пайшоў, рэквізыцыяў ні рабіў, а жыў звычайным, ціхім жыццем.

— «Ніто кум цыгар—файкес ідо!» (німа папіросы — люлька ёсьць) спакойна кажа ён цяпер нямецкаму салдату, частуючы яго люлькай.

Па нямецку Міхалка навучыўся у старой Сэркі, дзе ён калісь часта «трункаваў», а цяпер толькі тутун купляе.

І стары Міхалка часта мае храпку са мной пагаварыць аб сучасных справах. А так як цяпер у ваколіцы вельмі ціха, то ён ўдаецца у ніdaўнія успаміны большэвізму.

— У кожнай вёсцы хадзіла варта па начох, хадзіла са стрэльбамі з'ліварвэрамі—кажа ён.—Убіўствы, грабяжы, злад'ействы бывалі на кожным кроку. А якія страшныя бывалі, дзікія, дык толькі літуй, Божанька!—І вочы калолі, і насы і языкі і рукі адрэзывалі дык толькі літуй Божанька!

А самасуды, самасуды — жывых часам закопывалі у зямлі...

І тут ідзець пералік вёсак, засьценкаў, сяліб у ваколіцы, дзе розныя страшныя падзеі рабіліся.

— А цяпер?—пытаюся я у яго.

— Цяпер то Бог злітаваўся—ціха ўсюды, мірна, спакойна і можна жыць. Людзі прысьмірэлі, агледзэліся. А, барані Божа, немцы сюды ні прышлі-б—каюк было-б ўсім: пры дзяліцьбе зямлі галовы паскручывалі бы адзін аднаму на полі... Содом і Гамора пачаліся-б у нас на вясну. а цяпер Бог—бацька, будзем жыць.

З. Б.

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

КАРЬЕРА.

Быў калліграфістым,
Кепскім грамматыстым.
Стаў канцэлярыстым,—
У часьці паспарцістым.
Улопаўся «з нячыстым»
—Выляцеў са сьвістам,
—Й стаў соцыялістам
І фэдэралістам—,
Будзе комуністам,—
Потым анархістам,—
Узновіцца Раманаў—
Стане хуліганам.

Сальвэсь.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН. 6 г. м. Урадова Распаўсюджаныя праз Амстэрдам данясения ангельскіх газэтаў, што нібыто адзін галянчык з даручэння статс-сэкрэтара ф. Кюльмана зрабіў аднэй высока пастаўленай асобе, належачай да ангельскаго ураду пэуныя мірныя прапазыцыі, з'яўляюцца поўнасьцю выдуманымі. Высноўкі ангельскіх газэтаў зроблення на аснове гэтых вестак падаюць самы сабой.

— БЭРЛІН. 6 г. м. «Вольф» Французскія газэты робяць сэнсацыйныя паведамлення, аб пажары майстэрняў ў Фрыдрыхсгафэн. Подлуг паведамленняў прычынай пажару з'явіўся нібыто напад ангельска-амэрыканскаго надземнаго „флоту з Бэльфору. Па праўдзі-ж пажар вынік ат таго, што запаліўся сам сабою матэр'ял у дрэвасушыльні. У згарэўшым старым ангару для цэппэлінаў у той час праз шчасьлівае зданне ні было ні воднаго самалёта. Агонь быў лекалізаваны і ні дапушчаны да суседніх фабрычных будынкаў.

«Dz. Wil.».

— БАЗЭЛЬ. 6 г. м. Швэйцарскія газэты паведамляюць аб новых ніпарадках у Ірляндзіі. Ангельскія газэты пішуць аб арэштаванні больш 200 палітычных правадцаў у Ірляндзіі.

— КОПЭНГАГА. 6 г. м. «Вольф». Глаўная фінляндзкая кватэра паведамляе: Опэрацыі паўзятыя у замеры ачысьціць ваколіцы на захад і поўдня—захад ад Тавагуста ідуць і далей. За апошнія дні узято больш 2000 палонных. Прэдпрыемства Єпад началам ген. Ляндвэра скіраванае процiў ваюючых яшчэ у ваколіцах Коткі і Фрыдрыхсгамм чырвоных гвардэйцаў дайшло да станоўных рэзультатаў. Каля Інгерніс мы узялі больш за 1500 палонных, 7 гарматаў і 20 кулямётаў. Зрана у пядзелю мы узялі Котку. Лічба палонных перавысіла 2000. Пробе чырвона-гвардзейцаў уцячы марской дарогаю, перашкодзілі нямецкія караблі. Ідучыя каля Фрыдрыхсгамм нашыя войскі ўвайшлі у Вероёку і узялі больш за 3000 палонных. Уходняя армія здабыла берагавыя батарэі з цяжкімі гарматамі у Провзунг.

— КОПЭНГАГА. 6 г. м. «Berl hokalan». З прычыны падыходзячых з Фінляндзіі паведамленняў, што на руска-фінскай граніцы знайходзіцца значная лічба рускаго войска. з рускаго боку даюць вызсьняючыя паведамления, што

войско гэтае назначана для адпору фінляндскай белай гвардзіі, каліб яна захацела напасьці на форт Іно.

ЖЭНЭВА 6 гм. Подлуг «Echo de Paris» амэрыканская работніцкая дэлегацыя, якая на гэтых днях пакінула Англію высловілася проціў сьлікання міжнароднай соцыялістычнай конфэрэнцыі ні глядзя на усе усілкі ангельскай дэлегацыі скланіць да гэтаго сваіх амэрыканскіх гасьцей.

ЛУГАНО 6 гм. «Berl Hoh». Корраспондэнт «Secolo» паведамляе, што у Амьене пятая часьць будынкаў ушкоджана нямецкім абстрэлам; паміж іншымі будынкамі—прэфэктура, ратуша і музэй. Жыхары пакінулі горад. Немцы сталі абстрэлівваць Амьен і яго ваколіцы са усіх гарматаў.

Весткі з Расіі.

ЖЭНЭВА 5 гм. «Le Matin» паведамляе с Пецярбургу, што рускі урад запатрабаваў упаважнення. для высылкі у Маскву вайсковай часьці, для ахраны будынку у якім месьціцца нямецкае пасольства, бо цануючая ў сталіцы сытуацыя ні заспакаівае безпечнасьці дыплёматычных прэдставікаў чужых дзержаваў.

ЖЭНЭВА 5 гм. Парыжскі «Temps» паведамляе с Пецярбургу ад 3 маю. У надыходзячую нядзелю, як ў столетнюю гадаўшчыну нараджэння К. Маркса, Ленін абвесьціць палітычную амністыю. Дзякуючы гэтай амністыі мае быць звольнено каля 30,000 асобаў.

МАЛЬМО 5 гм. Подлуг данясенняў с Пецярбургу тамака у апошнія дні было зроблено шмат арэштаў. Паміж арэштаванными—нескольκі членаў Устаноўнаго збору. Народны камісар аб'яўляе, што арэшты знайходзяцца ў звязку з аткрыццем загавору проці савецкаго ураду.

Манархістычны настрой сярод казакоў выявіўся ў выбранні данскімі казакамі на мейсцо Каледзіна на пасаду атамана вайскоў, наушніка быўшаго цара гэнэрала Голубова, каторы пачаў ужо энэргічна працаваць над злучэннем усіх проціў—рэволюцыйных сілаў пад сваім сьцягам.

(«Dz. Polsk.» № 122).

ЛЕНДАН 6 гм. «Réuter». З Пэкіну паведамляюць у «Times» ад 29/IV. Казацкі атаман Семенов які змагаецца у Сыбіру проці большэвікоў высунуў свой авангард аж да Каракова (?) па ж.-д. лініі у Харбін. З Забайкалья паведамляюць аб моцна пашырэным Семеноўскім проці—большэвіцкім руху. Большэвікі падарвалі важны мост на р. Амур. Глаўная кватэра Семёнова усё іщчэ знаходзіцца у Манчжурыі.

На беларускім шляху.

— Дэлегаты Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, пасланыя ў Кіеў дзеля перагавораў з украінскім урадам, падалі народнаму міністру загранічных спраў Украінскай Народнай Рэспублікі гэткую заяву:

«Мы маемо ведамасьці, што ў межах Украінскай Народнай Рэспублікі утворэн корпус польскіх войск лікам 15.000 душ. Ні лічучы сябе ў праве цікавіцца пытаннем, якіе мэты мае гэта форміроўка, мы ні можам ні зьвярнуць увагі на той факт, што вельмі магчыма адпраўка паменёнаго польскаго корпуса ў межы Беларускай Народнай Рэспублікі (у Магілёўшчыну). Адпраўка гэта тым больш падобна да веры, што ў межах Магілёўскай губэрні знаходзіцца цяпер 1-шы корпус польскіх войск пад камандай гэнэрала Доўбор - Мусьніцкаго. Дзеля таго, што гэная бытнасьць становіць страшэнны ціжар для насялення краю, і прыймаючы пад увагу, што быццё польскіх войск у межах Беларускай Народнай Рэспублікі ёсьць рэзультат прыпадковых акалічнасьцей і у гэты мамэнт ні можэ быць нічым апраўдано, — наш урад чыніць крокі, каб паменёныя часьці былі магчыма хутчэй выведзены з Беларусі ў Польшчу, або распушчаны. Перш, чым будзе развязано пытанне аб бытнасьці 1-го корпуса, у адпраўцы новых польскіх форміровак з межаў Украінскай Народнай Рэспублікі ў Беларусь наш народ бачыць акт нііпрыхільнасьці і абіды для яго нацыянальнай годнасьці. З гэтай прычыны маемо гонар выказаць Вам, пане Міністру загранічных спраў Украінскай Народнай Рэспублікі, нашу прозьбу ўвайсьці у зносіны с камандай новасформаванаго польскаго корпуса у справе задач, якіх ён мае даходзіць, і ў кожным здарэнні выдаць загад, каб ні ў якім прыпадку ні была дапушчэна адпраўка яго ў межы Беларускай Народнай Рэспублікі».

Беларускі тэатр.

У «Беларускай Хаці» 6 мая ставілі драму «Хам» па сюжэту апавядання Э. Оржэшко. Збор нівялічкі. Ігра, як ніколі, пекная. Дружныя аплёдысмэнты публікі, каторая, трэба адзначыць, ні вельмі шаноўна адносілася да трагічных момэнтаў пьесы, прыдаючы ім дваякі сэнс. Вытрыманасьць і вельмі ўдачнае разьдяленне роляў відаць адразу. П. Мядзіолка ў ролі Пронкі—жывы натуральны абраз распушчанаі дзяўчыны, трагічная доля якой даводзіць яе да вяроўкі. Часамі, загарыцца ў душы яе іскарка сьвятой праўдзівасьці, але ж не! ні датрымлівае яна да канца свэей прысягі, злы агонь зноў распаліць сапсаванае сэрцо, а тут іщчэ зьявіцца на вочы зьдзяцінеўшая жабрачка Марцэлька і ўсе засьцілае туман: і сьвятая ласка старого мужа Паўлюка —збавіцеля яе і прысяга перад крыжам, і ўсякая надзея на чыстае пічасьце, ўсё адлетае, як толькі навее распустай ў пустой, загубленай душы, якая німожа ніяк падняцца нават і пасьля таго як на сьвет родзіцца дзіця—рэзультат аднаго з нілічаных грэхоў—каторае мусіло-б, здаецца, абудзіць ў гэтай душы матчынае пачуцце. Перамагае ў ей ваклізм і такою яна застаецца да нілюдзкаго канца шаленаго жыцця яе.

Вось гэткая ўдзячная роля была скарыстана артысткаю з безумоўнай пэўнасьцю. Трэба прызнацца, што гэта роля — яе роля. Пастаўце на яе мейсцо іншую асобу з нівялічкаго складу нашых артыстаў і вы ні ўбачыце таго, што тут патрэбна.

Добрай парай для Пронкі быў Паўлюк ў выкананні А. Крыніцы, які заменьваў рэжыс. Ф. Ждановіча праз тое, што той ў гэты дзень зусім ні меў часу праз вялікія клопаты над упарадкаваннем дэкорацыйнасьці. Стары Паўлюк Акунь даруе ўсе грэхі Пронкі як даўнейшыя, так і цяперашнія. Нават труп павесіўшайся блудніцы жалем займае простую душу яго. Што ж, ен—«хам». Чужое для яго шаленства Пронкі, якая усе ж хвалілася, што бацька яе смужыў такі ў канцэляры, чужая яна яму, апрача яе горкаго жыцця, яе марнаго льосу. Яна корміць яго атручанаю стравою, а ён і гэта гатоў дараваць ей дзеля яе збавення. Зло і грэх далека ад гэтаго «хама».

Удзячныя ролі дапоўняла Марцэлька (Пралеска) з ніспадзеванай здатнасьцю. Як чортава служка, як начная ведзьма, яна налетае на збаламучаную душу Пронкі і цягне, маніць яе на пакусу. Уся фігура артысткі папала ў «сваю» ролю.

В. Тарасік (Ульяна) і Зорка [Аўдоця] пекна спраўляліся ў ролях простых вясковых кабетаў.

Дэкорацыя ў I акце па мастацку зроблена арт. Андрэявым: убогія магілкі, зялены мурог, лозы над вадою, тут зроблено ўсё, што можна зрабіць на маленічкай сцэні «Беларускай Хаты».

Што датыча імітацыі, то ў апошнім акце вельмі ўжо моцна сьвістала завіруха; а можна шмат павальней.

7 мая пастаўлено было «Раскіданае Гняз‑до» Я. Купалы. Збор нават нізаметны, а ігралі усе такі як трэба. Найболей выдаліся Ф. Ждановіч (Сымон), П. Мядзіолка [Зоська] і В. Тарасік (Мадзі). Пралеска добра вела ролю хлопчыка Данілкі.

Знаемы.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 9 мая 1918 року.

ЗАХАДНЫ ТЭАТР ВАЙНЫ.

Між Іпэркам і Бэйлёлем праз увесь дзень рухавая артылерыйская чыннасьць. Нашы атакі паўдневей возера Дэкэрбушэ удаліся як мае быць. Рэйнскія і Баденскія войскі заўладалі ніпрыяцельскімі лініямі на працягу 2 кілемэтр. на ўсходнім беразі ручая Вівер. Яны, мабыць, папярэдзілі англо-французкую атаку і ні дазволілі ей стварыцца. Толькі па абодвых баках дарогі Рэнінгельст—Кэммель атрымаў ніпрыяцельскі напад поўнае развіцце. Ен быў эдбіты так сама, як і контр-атакі на нашыя, напова намі занятыя. пазыцыі. Мы ўзялі 675 палонных с 6 французкіх і 2 ангельскіх дывізыяў. напярпеўшых вялікія страты. Пры адбіцці французкіх атакаў на паўдневым беразі р. Ліс каля Бюкуа і паўднёвей Альбэрта мы ўзялі палонных. У часе ўнарайшай ніўдалаі атакі Аўстралійскаго войска каля дарогі Корбі—Брэ ў нашых руках засталося 45 палонных, між імі 4 ахвіцэры. Паўночней ручая Люс і на захаднім беразі Аўры артылерыйская чыннасьць заставалася падвышанай. Больш на фронці на шмат мейсцаў ўдалая работа разьведчыкаў.

За апошніх 3 дні вораг згубіў ў надземных бітвах і абстрэлам з зямлі 26 аэропляпаў. Об.-лейтэнант Шлёйх зьбіў ўчора 3 варожых аэропляны й дасягнуў праз гэта сваіх 26, 27 і 28 надземных перамогаў.

УСХ. УКРАІНА.

На паўночным беразі Азоўскаго мора мы прасунуліся да усьця Дону і занялі Ростоў.

Перамовы аб установі дэмаркацыйнай лініі хутка пачнуцца.

Першы-Генэрял-кватэрмэйстар фон-Людэндорф.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Далейшую распрадажу мення цэнтральнаго скпада упраулення дарожных работ пры X арміі (па расцэнцы да 500,000 руб.) дзеля уплаты пэнсіі і ліквідацыйных рабочым і служачым гэтай арганізацыі местовая управа спыніла да перадачы складу і высненння інвэнтарных астаткау склада.

У I-м пазычкова-зберэгацельным т-ве ніяк ні могуць назначыць аканчацельнаго дня агульнаго сходу членау дзеля разгляду і пацьвярджэння расходау за мінуушы год, сьметы на бягучы год і выбарау належачых асоб у прауленне і рэвізыйную камісыю.

Зьезд духавенства епархіі дзеля разгляду матэрыяльна-прававых інтарэсау духоунаслужыцеляу у зьвязку з неуплатай пэнсіі ад 4-го студзеня, а так-сама аб рэформах духоуных школ епархій, адбудзецца пасьля мая, да таго часу мае быць наладжэна почта і, мабыць, «Епархіальныя вѣдомости», за каторыя падпісная плата на год 15 руб. унесена падпішчыкамі яшчэ у пачатку 1918 году.

На Л. Р. ж. д. у упрауленскіх аддзелах падгатоука да ліквідацыі спрау ідзець поуным ходам. Самую ліквідацыю маюць пачаць пасьля мая месяца. Упрауленцы группамі едуць у Маскву у Раду Камісарау за падрахункам.

Беларускае т-во «Цэтка». 4-го мая г. г. у Менску злажылося Беларускае таварыство імені вядомай беларускай палітычнай дзеячкі і пісьменніцы Цеткі —Пашковіч. Скарочаная назва таварыства — «Цетка». Выбраны прэзыдыум у склад якога увайшлі: старшыней—П. А. Бадунова, таварышам старшыні А. Маліноуская, другім таварышам—К. П. Панько і сэкрэтаром—К. П. Маневіч.

Т-во «Цетка» ставіць сабе мэтай—памогу усім патрабуючым бедным беларусам, глауным чынам т-во «Цетка» мае апекавацца над дзяцьмі, вучнямі і старымі. Дзеля старых Т-во мае атчыняць багадзельні.

Т-во бярэ пад сваю апеку адчыніушыяся у Менску ясьлі, дзецкія каленіі сталоукі і інш. У члены таварыства прыймаюцца усе жадаючыя. Гадовы членскі узнос—3 руб. Спраукі выдае сэкрэтар таварыства—К. П. Маневіч Паліцэйская д. 14 кв. 1 ад 4-6 гадзіны.

Нарміроуку мяса нямецкае градоначальство бярэ у свае рукі. Мясны паек (5/8 ф. на душу на тыдзень) мае быць увезены с пачатку будучаго месяца. Аднпачасова апрацовываецца нямецкай уладай інструкцыя строгаго урэгуліравання, далейшай прадажы хлеба, цукру, і др.

У другім бонавым бюро (Саборная, д. Айзэнштата) новыя бонавыя кніжкі будуць выдавацца ад 11-го па 15 мая. Цэна кнігі— два рублі.

У першым бонавым бюро (Юрьеуская, 2) выдача кніг пачата 7-го мая.

Рэдактар А. Прушынскі.

Выдавецтво Т-во «Заранка».

Друкарня Я. Грынблата